# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 1 (675) | Аўторак, 5 студзеня 1988 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.


# Сесія—суддзя справядлівы, суровы

**Адышоў у гісторыю юбілейны для краіны 1987 год. Ён стаў адметнай вяхой для вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школы. Пачалася карэнная яе перабудова. На гэтым складаным шляху зроблены першыя крокі. Іх можна разглядаць праз прызму падрыхтоўкі і здачы студэнтамі зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі.**

## З НОВЫМ ПАДЫХОДАМ

З усёй адказнасцю можна сказаць, што на нашым факультэце робіцца нямала для паспяховага ажыццяўлення задач па перабудове вышэйшай школы. На ўсіх курсах і на факультэце ў цэлым уведзена студэнцкае самакіраванне, дзейнасць якога адчуваецца ва ўсіх сферах нашага жыцця. У прыватнасці, пяцікурснікі правялі агульны сход, на якім па-дзелавому абмеркавалі найбольш актуальныя пытанні падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. Было выказана шмат слушных парад. Пажаданні студэнтаў улічаны і ўнесены некаторыя змяненні ў вучэбныя праграмы па курсах «Аўтаматычныя сістэмы кіравання», «Методыка выкладання матэматыкі», спецкурсаў па прафарыентацыі і школазнаўству і г. д.

Пасля праходжання пераддыпломнай педагагічнай практыкі студэнты значна больш адчуваюць пэўныя прабелы універсітэцкай праграмы, адсутнасць сваёй цеснай сувязі са школай, што не дазваляе авалодаць неабходнымі педагагічнымі навыкамі для практычнай работы. На ўхіленне гэтых і некаторых іншых недахопаў накіраваны нашы намаганні.

Сёлета на факультэце ўпершыню пачалі праводзіць аналіз якасці практычных і лабараторных заняткаў на першых і другіх курсах. Мэта — выпрацаваць рэкамендацыі па ўдасканальванню методыкі іх правядзення і больш дакладна ўлічваць час для самастойнай працы студэнтаў.

На другіх—пятых курсах пачалі праводзіць кантрольныя работы па матэматычных дысцыплінах. Гэта дазваляе высветліць веды студэнтаў, атрыманыя за папярэднія вучэбныя семестры. І вось для чаго. Звычайна, лекцыю чытае дацэнт. Практычныя заняткі праводзіць асістэнт. Экзамен зноў прымае дацэнт. І калі многія студэнты атрымлівалі нездавальняючыя адзнакі, дык цяжка было вызначыць, чыёй віны тут больш: дацэнта, асістэнта ці самога студэнта? Напісанне кантрольных работ дазваляе даць ацэнку больш грунтоўна.

Гэты эксперымент мы абмеркавалі на Савеце факультэта. Зробленыя вывады прымусілі многіх выкладчыкаў істотна змяніць свае адносіны да вынікаў працы.

З першых крокаў перабудовы вышэйшай школы рашуча пазбаўляемся ад тых, хто раней пастаянна хадзіў у «хвасцістах», не толькі сам не жадаў авалодваць ведамі па абранай спецыяльнасці, але і нярэдка перашкаджаў аднакурснікам. На факультэце засталіся юнакі і дзяўчаты, якія па-сапраўднаму жадаюць вучыцца. Для прыкладу возьмем пяцікурснікаў. Зімовая сесія для іх ужо закончылася. Яе паказчыкі прыкметна лепшыя, чым былі ў гэтай катэгорыі студэнтаў летась.

На гэтым тыдні пачынаюцца экзамены для студэнтаў астатніх курсаў. Спадзяемся, што і яны парадуюць трывалымі ведамі. Ва ўсякім разе залікі здадзены таксама з вышэйшым працэнтам.

І апошняе, аб чым хочацца сказаць. Вышэйшая школа цяпер знаходзіцца ў новых умовах. Значна пашыраецца мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў, ад заказаў на іх залежыць жыццядзейнасць кожнага факультэта. Натуральна, перш за ўсё, пад увагу бярэцца якасць падрыхтаваных спецыялістаў. Немалаважным з'яўляецца і своечасовае заключэнне дагавораў, згодна якіх будуць размяркоўвацца выпускнікі. У гэтым напрамку дэканатам і кафедрамі праведзена значная работа. Заключаны неабходныя дагаворы з Беларускім металургічным заводам, ВА «Гомсельмаш», станкабудаўнічым вытворчым аб'яднаннем імя С. М. Кірава і некаторымі іншымі вядучымі прадпрыемствамі нашага горада і вобласці.

**М. СЕЛЬКІН,**
**дэкан матэматычнага факультэта, дацэнт.**

## ПАВЫШАЕМ ПАТРАБАВАЛЬНАСЦЬ

Перабудова вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі патрабуе перш за ўсё павышэння якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. Для гэтага неабходны рашучыя кардынальныя меры. На пасяджэнні Савета факультэта мы вырашылі не дапускаць студэнтаў да напісання дыпломных работ, калі агульны сярэдні бал за ўсе гады іх вучобы акажацца ніжэй 4. Такія студэнты будуць здаваць дзяржаўныя экзамены. Прынятае рашэнне аказала спрыяльны ўплыў на студэнтаў, якія раней працавалі не на поўную сілу, іх не турбаваў канчатковы вынік. Цяпер справы абстаяць інакш. У прыватнасці, асобныя акадэмічныя групы 4—5 курсаў здалі ўсе залікі, як кажуць, без адзінага паўторнага заходу.

І яшчэ пра тое, аб чым нельга не сказаць. У папярэднія гады нярэдка можна было пачуць аб непісьменнасці нашых асобных выпускнікоў. Апраўдвацца тут нельга. Падобныя факты сапраўды мелі месца. Цяпер мы рашуча ўключыліся ў барацьбу за павышэнне пісьменнасці кожнага нашага студэнта. Гэтаму садзейнічае загад па Мінвузу рэспублікі аб абавязковым увядзенні дыктовак па беларускай і рускай мовах — у адпаведнасці са спецыяльнасцю. Гэтыя пісьмовыя работы праводзяцца перад залікам па данай дысцыпліне. На жаль, іх вынікі далёка не суцяшальныя. Так, сярод студэнтаў рускага аддзялення з дыктоўкай не справілася, наколькі памятаецца, 38 чалавек. Не намнога лепшы паказчык і ў студэнтаў беларускага аддзялення.

Тыя, хто не атрымае станоўчую адзнаку па дыктоўцы, не дапускаецца да заліку. У гэтым бачыцца дзейсная мера да больш сур'ёзных адносін ў павышэнні пісьменнасці будучымі філолагамі.

Натуральна, праблем у нас яшчэ нямала. Аднак, калі гаварыць у цэлым, паварот да лепшага на факультэце прыкметны і адчувальны. Павысілася дысцыпліна студэнтаў, стала менш пропускаў заняткаў без уважлівых прычын. Больш карысці пачалі прыносіць для студэнтаў азнаямляльна-педагагічныя і пераддыпломныя практыкі. Ну, а агульныя вынікі ўсёй нашай работы на шляху перабудовы адлюструюць вынікі сесіі. Ёсць упэўненасць, што яны ў параўнанні з папярэднімі акажуцца некалькі лепшымі.

**М. ГУЛІЦКІ,**
**дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта, дацэнт.**

## СУСТРЭЛІСЯ З ЗАМЕЖНЫМІ СТУДЭНТАМІ

На першым-трэцім курсах гісторыка-філалагічнага і матэматычнага факультэтаў нашага універсітэта набываюць вышэйшую адукацыю па рускай мове і літаратуры, а таксама па матэматыцы больш за 40 юнакоў і дзяўчат з 16 краін Азіі і Афрыкі. Выкладчыкі, якія працуюць з замежнымі студэнтамі, імкнуцца перадаць ім увесь свой багаж ведаў. Ва універсітэце многае робіцца і для таго, каб у вольны ад вучобы час забяспечыць ім цікавы адпачынак.

У мінулую сераду замежныя студэнты былі прыняты ў рэктараце. На сустрэчы прысутнічалі рэктар акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць, сакратар парткома М. І. Старавойтаў, старшыня прафкома студэнтаў Н. І. Колтышава, прадстаўнікі іншых кіруючых органаў ГДУ. Знамянальна, што гэта сустрэча адбылася ў дзень 65-годдзя ўтварэння СССР. Наша краіна на ўсім шляху сваёй гісторыі з'яўляецца апорай міру, імкнецца да ўмацавання дружбы і супрацоўніцтва з народамі ўсіх кантынентаў планеты. Сведчаннем гэтаму служыць і тое, што многія тысячы юнакоў і дзяўчат з розных краін свету набываюць у СССР вышэйшую адукацыю па розных спецыяльнасцях, у тым ліку і ў нашай вядучай вышэйшай навучальнай установе Беларускага Палесся.

На сустрэчы замежным студэнтам былі дадзены адказы на цікавячыя іх пытанні, выслуханы выказаныя прапановы.

Акадэмік Б. В. Бокуць горача павіншаваў замежных студэнтаў з надыходзячым 1988 годам, пажадаў ім здароўя, асабістага шчасця, поспехаў у вучобе, у барацьбе за захаванне міру на нашай планеце.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За актыўны ўдзел у развіцці студэнцкіх атрадаў Ганаровай граматай ЦК ВЛКСМ узнагароджаны:

**Карака Уладзімір Мікалаевіч** — старшы навуковы супрацоўнік фізічнага факультэта.

**Паветка Таццяна Мікалаеўна** — студэнтка 3-га курса біялагічнага факультэта.

• • •

За актыўны ўдзел у рабоце студэнцкіх атрадаў па ўборцы ўраджаю 1987 г. Гомельскі абласны аграпрамысловы камітэт і абком прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу ўзнагародзілі Ганаровымі граматамі выкладчыкаў і студэнтаў нашага універсітэта:

**Караку Уладзіміра Мікалаевіча** — старшага навуковага супрацоўніка фізічнага факультэта.

**Котава Генія Клаўдзіевіча** — дацэнта кафедры ТСАЭІ эканамічнага факультэта.

**Лукашэнка Алу Аляксандраўну** — студэнтку І-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.

**Руева Мікалая Мікалаевіча** — студэнта 4-га курса фізічнага факультэта.

**Таміліна Аляксандра Станіслававіча** — студэнта 1-га курса матэматычнага факультэта.

**Цуканава Генадзя Міхайлавіча** — студэнта 2-га курса эканамічнага факультэта.

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта горача віншуюць узнагароджаных і жадаюць ім новых поспехаў у грамадскай і працоўнай дзейнасці.**

## Віншуем!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры педагогікі і псіхалогіі горача віншуюць выпускніцу аспірантуры пры названай кафедры ЦАЛУЙКА Валянціну Міхайлаўну (навуковы кіраўнік — прафесар, член-карэспандэнт АПН СССР І. Ф. Харламаў) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.**



**Поспехі ў вучобе самі па сабе не прыходзяць. Каб іх дасягнуць, студэнту патрэбны карпатлівая праца над канспектамі, падручнікамі, а таксама набыццё добрых практычных навыкаў у лабараторыях. Без усяго гэтага добрым спецыялістам у канчатковым выніку не станеш. Студэнткі гр. Ф-24 фізічнага факультэта Таццяна Бабак і Алена Зяленская поўнасцю згодны з гэтай думкай. Наш фотакарэспандэнт А. Ульянкіна сфатаграфавала дзяўчат у час выканання лабараторнай работы па магнетызму.**

# ТВОРЧЫ ПОШУК МАЛАДЫХ — НА СУЧАСНЫ ЎЗРОВЕНЬ!

## РАЗЛІК НА ТЭХНІКУ

На XX з'ездзе ВЛКСМ адзначалася, што ў сучасных умовах наспела вострая неабходнасць перабудовы ў камсамоле. Гэта азначае паварот да жывой, паўсядзённай, карпатлівай работы з моладдзю, выкаранення бюракратызму, фармалізму, паператворчасці, павышэння адказнасці за вынік любой справы.

Дзейнасць камсамольскіх органаў сёння нельга ўявіць без усё узрастаючай інфармаванасці. Гэта заканамерны працэс. Але ставіцца задача максімальна скараціць затраты часу на работу з усемагчымымі паперамі. Тут нельга абысціся без аўтаматызаванай апрацоўкі паступаючай дакументацыі і інфармацыі.

**Якой жа павінна быць сістэма апрацоўкі даных на ЭВМ у абкоме ЛКСМБ?**

Над стварэннем такой сістэмы ўжо другі год працуе група нашых студэнтаў — будучых спецыялістаў па арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі. У мінулым навучальным годзе выпускніцы Ірына Галькіна, Людміла Драздова і Ала Гапоненка ў якасці аб'ектаў для дыпломнага праектавання выбралі аддзел кадраў і агульны аддзел абкома ЛКСМБ. Тут дзяўчаты вывучалі паступаючую інфармацыю, функцыі работнікаў аддзелаў і падлічылі: з устаноўкай персанальных ЭВМ у гэтых аддзелах працаёмкасць работ знізіцца амаль на дзве трэція.

У бягучым навучальным годзе тры студэнткі ў сваіх курсавых праектах працягваюць распрацоўку аўтаматызаванага рабочага месца (АРМ) работніка абкома камсамола. А яшчэ тры выпускніцы — Людміла Палхоўская, Ларыса Бурава і Алена Іваноўская на пераддыпломнай практыцы займаюцца распрацоўкай аналагічнага АРМа ў ЦК ЛКСМБ. Справы ідуць поўным ходам. Спадзяемся, што ў нас хопіць сіл, ведаў і настойлівасці, каб паспяхова завяршыць работу.

Няма ніякага сакрэту ў тым, што яшчэ вельмі часта для дыпломных і курсавых праектаў студэнты бяруць пажоўклыя і запыленыя пастаноўкі задач, якія незразумела як захаваліся на асобных вылічальных цэнтрах і выпадкова трапілі на вочы практыкантам. У нашай спецыяльнасці правіла — чым старэй рукапіс, тым ён каштоўнейшы — не дзейнічае. Значна лепшай праверкай ведаў студэнта-старшакурсніка і адначасова багатай крыніцай вопыту будзе работа над патрэбнымі практыцы задачамі. На жаль, не заўсёды такую работу могуць прапанаваць на практыцы або на кафедры. Дык давайце шукаць разам, нарэшце, патрабаваць яе. У горадзе працуе гаспадарча-разліковы клуб навукова-тэхнічнай творчасці моладзі. Тут ужо сабралі даволі аб'ёмісты партфель заказаў з прадпрыемстваў і арганізацый горада на выкананне навукова-тэхнічных распрацовак. І для будучых эканамістаў па працы, і для будучых інжынераў-эканамістаў знойдзецца патрэбная работа.

**Л. АКСЁНАВА,**
**к. э. н., дацэнт кафедры АМАЭІ, старшыня абласнога Савета маладых вучоных і спецыялістаў.**

У краіне ідзе работа па стварэнню адзінай грамадска-дзяржаўнай сістэмы навукова-тэхнічнай творчасці моладзі. Яна з'явіцца важным механізмам у праяўленні ініцыятывы і навуковага пошуку.

У чым адрозненне сістэмы НТТМ ад розных спроб зрушыць з мёртвай кропкі навукова-тэхнічную творчасць моладзі?

Па-першае, сістэма НТТМ аб'ядноўвае размежаваныя намаганні зацікаўленых у НТТМ арганізацый. Па-другое, рашэнні каардынацыйных саветаў НТТМ з'яўляюцца абавязковымі для выканання як грамадскімі, так і дзяржаўнымі арганізацыямі. Па-трэцяе, — і гэта самае галоўнае — у наяўнасці гаспадарчага механізма: раённыя саветы НТТМ маюць свой рахунак у банку і свой фонд.

Асноўным звяном гаспадарчага механізма сістэмы НТТМ сталі адпаведныя цэнтры, ствараемыя як пасрэднікі для забеспячэння сувязі паміж прадпрыемствамі, арганізацыямі, што маюць патрэбу ва ўкараненні дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, так і маладымі спецыялістамі, вынаходнікамі. Такіх цэнтраў цяпер у краіне налічваецца больш за 60. Цэнтры НТТМ заключаюць гаспадарчыя дагаворы з прадпрыемствамі, а маладыя вынаходнікі працуюць над іх рэалізацыяй у нерабочы час, атрымліваючы за выкананую работу заработную плату.

## СПРАВА ЗНОЙДЗЕЦЦА КОЖНАМУ

Праца ў творчым калектыве пад эгідай цэнтра НТТМ дазваляе маладому інжынеру, студэнту, рабочаму вырашаць тыя тэхнічныя праблемы, якія выклікаюць у яго цікавасць, адчуць сябе стваральнікам новай тэхнікі .

У 1986 г. Гомельскім абкомам і гаркомам камсамола было прынята рашэнне аб стварэнні ў г. Гомелі клуба НТТМ з мэтай адпрацоўкі мадэлей адпаведнага цэнтра.

Клуб НТТМ заключыў 10 гаспадарчых дагавораў на суму больш за 100 тыс. руб. Два з іх ужо выкананы. Астатнія будуць завершаны ў першым квартале бягучага года. Іх выкананнем занята звыш 70 інжынераў, вучоных, студэнтаў.

Распрацоўка гаспдагаворных тэм не з'яўляецца адзіным напрамкам дзейнасці клуба НТТМ. Адначасова вядуцца работы па арганізацыі розных конкурсаў па вырашэнню разнастайных вынаходніцкіх задач.

Не так даўно было прынята рашэнне аб стварэнні цэнтра НТТМ. На мінулым тыдні па выніках конкурсу на замяшчэнне вакантнай пасады дырэктара ім выбраны інструктар аддзела навукова-тэхнічнай творчасці моладзі ЦК ЛКСМБ Генадзь Багдановіч.

Да моманту выбараў засталося тры прэтэндэнты. Адзін з іх — інжынер завода пускавых рухавікоў Аляксандр Багдановіч. Вельмі сур'ёзны чалавек, добра ведае вытворчасць і таму, напэўна, яго праграма датычылася інжынерных распрацовак і іх укаранення ў вытворчасць. Другі прэтэндэнт — навуковы супрацоўнік нашага універсітэта Уладзімір Карака. Праграма яго кароткая, тэзісная, але добра адчувалася, што кандыдат на крэсла старшыні клуба галоўным лічыць тое, каб прыбыткі клуба былі як мага большыя. Не так важна для яго, чым канкрэтна клуб будзе займацца, абы была добрая капейка. Але пераважную большасць галасоў атрымаў трэці кандыдат у старшыні — Генадзь Багдановіч. Ён стаяў ля вытокаў цэнтра НТТМ, які зараз атрымоўвае статус клуба, лепш за іншых ведае справу, яго праграма самая грунтоўная. Трэба думаць аб прыбытках, лічыць Генадзь, але і памятаць, што галоўная мэта клуба — расшырэнне навукова-тэхнічнай творчасці моладзі ўсіх узростаў і прафесійных слаёў: ад школьнікаў да маладых вучоных і спецыялістаў, калгаснікаў, рабочых. На гэтых выбарах перамагла грунтоўнасць, кампетэнтнасць і гаспадарчая дбайнасць.

## ЯК СТАЦЬ ВЫНАХОДНІКАМ?




**Абком ЛКСМБ, абласны савет УТВР, Гомельскі гарадскі клуб НТТМ, рэдакцыя газеты «Гомельская праўда» і абласное тэлебачанне арганізуюць завочны клуб навукова-тэхнічнай творчасці (НТТ). «Вектар». Запрашаем прыняць у ім удзел камсамольцаў і моладзь, школьнікаў, усіх, хто любіць тварыць, выдумваць, спрабаваць.**

### ПРА ЗАДАЧЫ КЛУБА

Гісторыя чалавецтва пачыналася з вынаходстваў. Вынаходзіць давялося ўсё, што нас акружае. Мы, напрыклад, не ведаем, хто і калі змайстраваў парус. Але ўявіце сабе, што перажыў чалавек, які ўпершыню яго падняў? Моцна стукала сэрца, хацелася плыць і плыць насустрач невядомасці...

З вынаходніцтвам заўсёды звязаны захапляючыя прыгоды, цікавыя здарэнні, яно прыносіць вялікую карысць людзям. Але вось жа парадокс: мала хто хоча ім займацца. Прычыны тут розныя. Першая — недасканалы гаспадарчы механізм, які не вельмі выклікае цікавасць да стварэння і ўдасканалення тэхнікі.

Другая прычына — недастатковая гатоўнасць людзей ствараць сучасныя машыны, пераўзыходзячыя лепшыя сусветныя ўзоры. І справа тут не толькі ў нізкай кваліфікацыі. Для выяўлення скрытых рэзерваў тэхнікі, гарантаванага вырашэння складаных задач мала быць проста добрым спецыялістам. Вынаходніцтву, як і любой іншай справе, трэба вучыцца. Перш за ўсё трэба асвоіць навуку, якая называецца тэорыяй сістэм. Яна разглядае заканамернасці развіцця тэхнікі, а таксама спецыяльныя метады пастаноўкі вынаходніцкіх задач і іх вырашэння.

Веданне гэтых заканамернасцей і метадаў дазваляе спраўляцца са складанымі тэхнічнымі праблемамі, прычым на высокім узроўні. На жаль, нават інжынеры, не гаворачы пра людзей іншых спецыяльнасцей, не маюць такіх ведаў. Таму ў нашым клубе будзе весціся гаворка пра некаторыя прыёмы вырашэння вынаходніцкіх задач.

Мы пастараемся навучыць удзельнікаў клуба думаць не шаблонна, далучыць іх да пастаяннай творчай работы, якая для вынаходніка гэтак жа патрэбна, як трэніроўка для спартсмена. Заданні будуць давацца з улікам узростаў, разнастайных схільнасцей. Спадзяёмся, што вы дапаможаце вырашыць канкрэтныя праблемы, якія стаяць перад прадпрыемствамі, арганізацыямі вобласці. Сваю работу клуб і пачынае з конкурсу.

### УМОВЫ КОНКУРСУ

На дапамогу ўдзельнікаў клуба спадзяецца Гомельская гандлёвазакупачная база гарплодаагароднінагандлю.

**ЗАДАННЕ № 1**

**Капусту для квашэння закладваюць у чан (памерам 3×3×4,5 метра) з бетоннымі сценкамі, абкладзенымі поліэтыленавай плёнкай. Гатовую капусту для дастаўкі ў магазіны ўручную вымаюць з чана і перагружаюць у бочкі. Працэс непрадукцыйны. Які выхад?**

**ЗАДАННЕ № 2**

**Пры закладцы капусты на квашэнне ад качаноў аддзяляюць качарыжкі, бо яны выклікаюць загніванне. Робіцца ўсё ўручную.**

**Як паскорыць работу?**

На разгляд камісіі прадстаўляйце гатовыя распрацоўкі, тэхнічныя вырашэнні, эскізы. Пры падвядзенні вынікаў будуць улічвацца: магчымасць укаранення, велічыня затрат пры гэтым, арыгінальнасць рашэння, падрабязнасць яго выкладання.

Устаноўлены прэміі па 200 рублёў за кожнае заданне.

Зразумела, прапаноў мы чакаем і ад школьнікаў. Калі ж задачы здаліся рабятам занадта складанымі, можна падумаць над наступнай:

**ЗАДАННЕ № 3**

**У канцы мінулага веку на заводах, што выпускалі бяздымны порах, часта адбываліся выбухі па наступнай прычыне: порах выпрабляўся па «мокрай» тэхналогіі, яго потым сушылі з дапамогай цёплага паветра. Але пры гэтым паветра часта электрызавалася, праскоквала іскра— і адбываўся выбух. За дапамогай звярнуліся да вядомага рускага вучонага Д. І. Мендзялеева, які і прыдумаў, як пазбегнуць выбухаў. Што ён прапанаваў?**

За гэту задачу ўстаноўлен прыз-кніга (гл. фота).

Такі ж прыз атрымае і той, хто прапануе для нашага клуба арыгінальную назву. Арганізатары не лічаць назву «Вектар» самай удалай.

Прапановы, адказы дасылайце на адрас: 246000, г. Гомель, вул. Савецкая, 26, ГК ЛКСМБ, завочны клуб НТТ. Тэлефоны 55-20-09, 55-22-12.

Наш наступны раздзел — «Скарбонка ідэй». Прапануем яго запоўніць, выразаць і выслаць на ўказаны вышэй адрас. Вашы меркаванні, ідэі дапамогуць абкому камсамола, абласному савету УТВР, гарадскому клубу НТТМ, а таксама ўдзельнікам завочнага клуба НТТ «Вектар» выявіць і «расшыць» вузкія месцы на прадпрыемствах, у арганізацыях.

### СКАРБОНКА ІДЭЙ

**Якія тэхнічныя праблемы на вашым прадпрыемстве, у арганізацыі патрабуюць неадкладнага вырашэння** ________________

________________________________________

**Ваша ідэя, прапанова па іх вырашэнню** ________________

________________________________________

________________________________________

**Месца работы, вучобы** ________________

**Прозвішча і імя, дамашні адрас, тэлефон** ________________

________________________________________

### І У ЗАКЛЮЧЭННЕ — НАША АБ'ЯВА

У Гомелі існуе грамадскі інстытут метадалогіі тэхнічнай творчасці. Моладзь навучаецца ў ім сучасным метадам рашэння вынаходніцкіх задач, пошуку новых тэхнічных рашэнняў (мазгавы штурм, марфалагічны аналіз, алгарытм вырашэння вынаходніцкіх задач, асновы функцыянальна - вартаснага аналізу).

Пачынаецца новы курс навучання. Прыём жадаючых працягваецца. Заняткі будуць праводзіцца ў аўторак і чацвер з 18-30 да 21-00 у памяшканні БІЧТу ў аўдыторыі № 1506.

**Матэрыялы клуба падрыхтаваў В. ЦІМОХАЎ.**

